**Грыгаровіч Я.Д.,**
*прафесар, рэктар Беларускага універсітэта культуры*

# АСНОЎНЫЯ НАКІРУНКІ ЎДАСКАНАЛЕННЯ КУЛЬТУРАЛАГІЧНАЙ АДУКАЦЫІ

У наш час гістарычных пераўтварэнняў і сацыяльных змен у жыцці беларускага грамадства ўсё большая колькасць людзей пачынае ўсведамляць неабходнасць сур'ёзных эканамічных пераўтварэнняў.

Ёсць шмат падстаў сцвярджаць: дактрынёрскі сацыялізм, "пабудаваны ў асобна ўзятых краінах", не спраўдзіў сябе, даказаў немэтазгоднасць і немагчымасць свайго існавання. Пакрысе ідзе на спад і развіты капіталізм. Ні той, ні другі спосабы вытворчасці не забяспечылі грамадству камфортнага існавання. Сведчанне таму — пераходныя формы сацыяльна-эканамічных укладаў у некаторых краінах Еўропы. На змену канстантным формам прыходзяць інварыянтныя эканамічныя ўклады, якія ўжо атрымалі развіццё ў некаторых краінах свету. Гэты шлях, думаецца, наканаваны і нашай маладой дзяржаве.

Стварэнне інварыянтнага эканамічнага ўкладу магчымае толькі пры ўмове сфарміраванасці новага менталітэту свабоднага чалавека з нестандартным мысленнем, здольнага да арыгінальных рашэнняў і ўчынкаў у звыклых абставінах, хуткага выбару аптымальных шляхоў пошуку, выкарыстання патрэбнай інфармацыі ў прафесійнай і сацыяльнай дзейнасці. Такі чалавек павінен умець аператыўна фіксаваць інфармацыйныя патокі, назапашваць якасны тэзаўрус ведаў. Фарміраванне паказанага менталітэту ўяўляе задачу, якая сцягвае ў вузел рашэнне ўсіх праблем рэфармавання нашага грамадства. Толькі чалавек з інварыянтным

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спосабам мыслення здатны вырашыць праблемы і задачы інварыянтнага сацыяльна-эканамічнага ўкладу.

З'яўленне такога чалавека магчымае на аснове культуралагічнай адукацыі, якая сістэматызуе мысленне, развівае крэатыўнасць асобы, фарміруе менталітэт свядомы, актыўны, дзейсны. Да таго ж, культуралагічная адукацыя — гэта галоўная канструкцыя духоўнасці людзей, што вызначае іх дзейнасць, стасункі, учынкі, паводзіны. Ёсць сэнс нагадаць: гуманітарныя веды ўсёабдымныя па сваёй сутнасці, рознабаковасці. Ад іх паходзяць усе іншыя нашы веды. Успомнім Дз.І. Мендзялеева: "Хімія не магла квітнець раней за матэматыку. Матэматыка — раней за філасофію, а апошняя не магла з'явіцца без поспеху людзей у паэзіі".

Пабудова культуралагічнай адукацыі як вывучэння, засваення і ўзнаўлення сістэмнай сукупнасці духоўных і матэрыяльных каштоўнасцей, назапашаных чалавецтвам на працягу развіцця, выклікае значныя цяжкасці. Да гэтай пары не ўсталявалася канчатковага разумення змястоўнага аспекту культуралогіі як прадмета вывучэння. Структурна ён падраздзяляецца на тэорыю, гісторыю культуры і (у большасці расійскіх ВНУ) прыкладную культуралогію.

Асабліва фармалістычным у змястоўным плане з'яўляецца раздзел гісторыі культуры. Часцей за ўсё гэта або эмпірычнае пералічэнне разнастайных гістарычных дасягненняў сусветнай культуры, або вывучэнне адной галіны культуры, блізкай пэўнай спецыяльнасці альбо накірунку ўстановы, а бывае, знаёмства толькі з гісторыяй мастацтва, асабліва ў спецыялізаваных вышэйшых навучальных установах.

Апошнім часам значнае распаўсюджванне ў культуралагічных універсітэтах атрымлівае выкладанне гісторыі культуры як тэарэтычнай мадэлі сінтэтычнага засваення ўзораў і стыляў культуры розных эпох, раскрыцця спосабаў інтэрпрэтацыі сэнсаў, сімвалаў культуры. Мяркуем, што



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

за гэтай трактоўкай — будучыня, бо яна грунтуецца на вывучэнні ўсіх культуралагічных з'яў сінкрэтычна, інтэграванa, ва ўзаемнай абумоўленасці.

Вывучэнне аб'ектаў у іх узаемасувязі, цэласнасці асэнсоўваецца вучонымі як сістэмны (або сістэмна-структурны) падыход, што інтэнсіўна абмяркоўваецца ў філасофска-метадалагічным і псіхалагічным планах (гл. даследаванні І.В. Блаўберга, Л.С. Выгоцкага, Б.Р. Ананьева, Л.І. Бажовіч, Ж. Піажэ, Джона Андэрсана і інш.). Такі падыход дае магчымасць для таго, каб вывучаць аб'ект у спецыфічнай яго цэласнасці на ўзроўні, адэкватным характару вывучаемых функцый і ўласцівасцей (Энгельгардт В.А. Интегратизм — путь от простого к сложному в познании явлений жизни // Вопр. философии. — 1970. — № 11. — С. 104). Ён мае на ўвазе вывучэнне аб'екта як складана функцыяніруючага цэлага, а таксама вылучэнне частак або элементаў у спецыфічных сувязях унутры цэлага і інш.

У педагогіцы пачатак тэарэтычнай распрацоўкі сістэмнага падыходу звязаны з імем Ф.Ф. Каралёва, які ўпершыню паставіў пытанне важнасці сістэмнага падыходу і магчымасці яго выкарыстання ў педагагічных даследаваннях (гл.: Королев Ф.Ф. Системный подход и возможности его применения в педагогических исследованиях // Советская педагогика. — 1970. — № 9. — С. 103—113). Следам ідуць работы Л.І. Новікавай (1970), Г.А. Ільiной (1973), Ю.К. Бабанскага, З.І. Васільевай, П.І. Підкасістага (1973), Л.М. Панчэшнікавай (1974), В.А. Сласцёніна (1975), Н.В. Кузьміной (1980) і інш.

Сістэмны падыход педагогі разглядаюць як спецыфічны падыход да навучальнага працэсу, што ўключае аналіз педагагічных з'яў не толькі з боку асобных іх кампанентаў, але і ў іх узаемасувязі, узаемадзеянні. Таму педагагічная сістэма разглядаецца як "множнасць узаемазвязаных структурных і функцыянальных кампанентаў, падпарадкаваных мэтам выхавання,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адукацыі і навучання падрастаючага пакалення і дарослых людзей" (Методы системного педагогического исследования /Под ред. Кузьминой Н.В. — Л.: ЛГУ, 1980).

Навучальны працэс, які ўяўляе самарэгулюючую адкрытую сістэму, будзе ўключаць у такім выпадку наступныя структурныя кампаненты: сістэму навуковых ведаў, уменняў, навыкаў, што павінен засвоіць студэнт; паводзіны выкладчыка з яго адносінамі да жыцця, уласнай дзейнасці, навукі, мастацтва; актыўнае засваенне сістэмы ведаў і ўменняў; метады навучання, адпаведныя індывідуальна-псіхалагічным асаблівасцям студэнтаў, і інш.

Асаблівасці названых сістэм заключаюцца ў тым, што:

а) усе кампаненты падсістэмы служаць адной мэце;

б) змены аднаго з параметраў істотна ўплываюць на астатнія;

в) устойлівае функцыяніраванне падсістэмы патрабуе навукова абгрунтаванага кіраўніцтва ёй, каардынацыі і ўзгаднення працы ўсіх яе элементаў.

Сістэма мае заўсёды шматузроўневую, іерархічную будову, а важнейшай умовай выяўлення ўзаемаадносін паміж падсістэмамі з'яўляецца вызначэнне сістэмаўтваральнага фактару.

Такім сістэмаўтваральным фактарам у гэтым выпадку выступае, на наш погляд, эстэтыка-культурная дзейнасць, якая вызначае ўсе сувязі ў названай сістэме: паміж вучэбным матэрыялам і метадамі яго перадачы студэнтам, выкладчыкам і навучэнцамі, фарміраваннем і развіццём пэўных бакоў асобы студэнта. Менавіта планаванне, арганізацыя гэтай дзейнасці, кантроль за яе працяканнем, аналіз вынікаў і (на яго аснове) пастаноўка бліжэйшых задач з'яўляюцца асновай для атрымання плённай культуралагічнай адукацыі.

Адным з важнейшых накірункаў яе ўдасканалення можна лічыць сістэмна-структурны падыход да самога

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зместу навучання. Улічваючы тое, што эстэтыка-культурная дзейнасць звязана з выкананнем разнастайных функцый, змест навучання канцэнтруецца вакол ведаў, уменняў і навыкаў, неабходных ва ўдасканаленні гэтай дзейнасці. Да таго ж культуралагічная адукацыя разглядае любы прадмет як частку цэласна іерархічнай структуры матэрыяльных, духоўных і мастацкіх каштоўнасцей (М.І. Крукоўскі), як элемент цэласнай сістэмы, інтэрпрэтуючы яго ў кантэксце культуры як характэрны бок аднаго феномена. Тады, напрыклад, гісторыю музыкі пачынаюць вывучаць "не столькі на падрабязным аналізе і характарыстыцы асобных канкрэтных твораў кампазітара або фактаў яго біяграфіі, колькі на агульных рысах музыкі як віду мастацтва ўвогуле на дадзеным этапе яе развіцця... і, што самае галоўнае, на яе стылявой тыпалогіі ў параўнанні яе са стылявой тыпалогіяй іншых відаў мастацтва. Стылявая тыпалогія дае ўжо больш глыбокае і пераканаўчае сведчанне цэласнасці культуры" (М.І. Крукоўскі).

Сістэмнасць ведаў палягчае працэс засваення, трывалага запамінання ведаў, спосабаў актывізацыі самастойнай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, а ў выніку вядзе да ўсебаковасці і гарманічнасці ведаў, да іх мабільнасці, трансфармацыі (гл.: Яковль И.П. Интеграционные процессы в высшей школе.—Л.: ЛГУ, 1980. — С. 113). Для спецыяліста-культуролага прафесійнае ядро — гэта сінтэз культуралагічных (з прыкладной культуралогіяй) і псіхолага-педагагічных ведаў у іх адзінстве, узаемасувязі. Пры гэтым узрастае роля тэарэтычных ведаў, абагульненняў, якія даюць магчымасць засвойваць прынцыпы вырашэння практычных прафесійных задач, спосабы выканання асноўнай дзейнасці.

Аб'ектыўныя падставы для стварэння тэорыі культуралагічнай адукацыі закладзены ўжо самім характарам навучання студэнтаў культуралагічных і мастацкіх спецыяльнасцей, што адрозніваюцца разнастай-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

насцю вывучаемых дысцыплін: гістарычных, філасофскіх, сацыяльных, лінгвістычных, мастацтвазнаўчых, культуралагічных, псіхалагічных, педагагічных, метадычных і інш.

Засваенне гэтых бакоў культуры, здольнасць да аднаўлення і рэпрадукцыі ведаў у эстэтыка-культурнай дзейнасці магчымыя пры ўмовах разгляду студэнтамі розных бакоў спецыяльнасці, прафілізацыі выкладання цыклаў дысцыплін. Гэтую задачу можна вырашыць тады, калі:

а) у аснову вывучэння кожнай дысцыпліны будуць закладзены заканамернасці, характэрныя для культуры наогул;

б) прынцыпы, метады, арганізацыя, змест навучання будуць прадстаўлены педагагічнай тэорыяй у іх дыялектычным адзінстве, узаемаабумоўленасці (тады педагагічная тэорыя стане рухальнай сілай працэсу навучання);

в) ствараюцца інтэграваныя курсы, якія выключаюць таўталогіі, паўтарэнні, align="left"рознападстаўную арганізацыю матэрыялу і іншае (гэта дазволіць пераадолець раздробленасць вучэбных дысцыплін, іх невялікі аб'ём, які не дазваляе выкладчыку раскрыць сутнасць і змест курса);

г) пры сінхранізацыі дысцыплін, што вывучаюць гістарычныя аспекты развіцця цывілізацыі: агульнай, айчыннай гісторыі, гісторыі мастацтваў (музычнага, выяўленчага, тэатральнага, кінамастацтва, архітэктуры), — ствараецца ў свядомасці студэнта цэласная карціна свету, уяўленне заканамернасцей і вехаў развіцця цывілізацыі.

Наступны напрамак развіцця і далейшага ўдасканальвання культуралагічнай адукацыі звязаны з неабходнасцю выбару метадаў і сродкаў перадачы выкладчыкам і засваення студэнтам гэтага зместу. Яны павінны адпавядаць сутнасці вывучаемых дысцыплін, індывідуалізаваць працэс навучання ў вышэйшай школе. Распрацоўкі тэарэтычных асноў зместу культуралагічнай

адукацыі, галіновых методык павінны ўзаемна дапасавацца адно да аднаго, адлюстроўваць дыялектыку тэорыі яе практычнага ўвасаблення. Тэорыя тут служыць дзеля вызначэння падстаў, прынцыпова значных у кожнай з галіновых методык. Тэарэтычныя асновы, метадычныя прыёмы разам становяцца шляхамі пранікнення ў сутнасць практычных сітуацый, спосабамі арганізацыі эстэтыка-культурнай дзейнасці.

Асаблівую ролю ў рэалізацыі гэтага напрамку набывае самастойная пазнавальная дзейнасць студэнта. Справа ў тым, што эфектыўнасць лекцыйных заняткаў залежыць не толькі ад іх навуковай, інфарматыўнай змястоўнасці, але і ад наступнай работы студэнта па больш глыбокім асэнсаванні, засваенні матэрыялу. Уважлівае праслухоўванне лекцыі ўяўляе толькі першаснае ўспрыманне і асэнсаванне вучэбнага матэрыялу, а яно бывае звычайна павярхоўным і няпоўным. Дзеля таго каб матэрыял быў засвоены, студэнту неабходна ў дзень лекцыі папрацаваць з яе тэкстам па канспекце, падручніку, дапаможніку. Гэта звязана з тым, што ўспрымаемая падчас слухання лекцыі інфармацыя фіксуецца ў асноўным у аператыўнай памяці, не пераходзячы ў доўгатэрміновую (гэта значыць хутка забываецца). Пераход у доўгатэрміновую памяць адбываецца толькі пры неаднаразовым, праз пэўныя прамежкі часу, паўтарэнні матэрыялу. Калі гэтага не адбываецца на працягу некалькіх дзён, то каля 50 % матэрыялу забываецца ў першы дзень, а 20 % — на працягу першага тыдня. Такім чынам, ад самастойнай работы студэнта поўнасцю залежаць і якасць, і аб'ём засваення ім вучэбнага матэрыялу.

Праведзеныя намі на працягу дзесяці гадоў даследаванні паказваюць паступовы спад агульнага аб'ёму самастойнай работы студэнта, даволі нізкую якасць яе, адсутнасць планавання, кантролю выкладчыкаў за пазнавальнай дзейнасцю навучэнца. Да лекцый студэнты амаль зусім не рыхтуюцца, пасля іх праглядаюць свае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

канспекты толькі 3,5 % (!) студэнтаў. Яшчэ трывожней той факт, што да семінарскіх заняткаў рыхтуюцца толькі 42,7 % апытаных, усяго 9,2 % студэнтаў спадзяюцца на жыццёвы вопыт, 12 % ад усёй колькасці апытаных ніколі не рыхтуюцца да заняткаў, а 20,1 % апытаных студэнтаў наогул перапісваюць канспекты ў сяброў.

У педагагічнай навуцы падрабязна даследаваны практычна ўсе аспекты арганізацыі, планавання, кантролю самастойнай работы студэнтаў, а таксама шляхі яе актывізацыі, спосабы павышэння яе эфектыўнасці, каэфіцыенты працаёмкасці розных відаў вучэбнай дзейнасці. Размова ідзе аб неабходнасці асэнсавання значэння самастойнай работы студэнта, разумення таго, што без яе не можа быць вучэбнага працэсу, бо ён заўсёды двухбаковы і складаецца з выкладчыцкай дзейнасці і самастойнай кіруемай працы студэнта.

Нельга не дадаць: аптымальны змест, метадычная аснашчанасць, узброенасць галіновымі методыкамі, актыўная спецыяльна арганізаваная, кіруемая пазнавальная дзейнасць студэнта, што рыхтуе яго да ажыццяўлення разнастайных формаў эстэтыка-культурнай дзейнасці, павінны падтрымлівацца пастаянным практычным замацаваннем атрыманых ім ведаў і навыкаў. У гэтай сувязі азнаямленчая, вучэбная, вытворчая, пераддыпломная практыка, разнастайныя формы вучэбна-даследчай і навукова-даследчай работы, фальклорныя экспедыцыі, шырокая пазааўдыторная мастацкая дзейнасць, удзел у фестывалях, канцэртах, мерапрыемствах, бясспрэчна, дапамагаюць хутчэйшай адаптацыі будучага спецыяліста да яго прафесійнай дзейнасці ў галіне культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ